*Абмяркоўваем праект ЦК КПСС аб рэформе школы*

# АДПАВЯДАЕ ПАТРАБАВАННЯМ ЧАСУ

Усе савецкія людзі з вялікай увагай і цікавасцю пазнаёміліся з праектам ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы». Гэта рэформа прадугледжвае ўзняць работу школы на якасна новы узровень, што адпавядае курсу Камуністычнай партыі на планамернае і ўсебаковае ўдасканальванне развітога сацыялізму.

Савецкая школа на сучасным этапе развіцця павінна навучаць і выхоўваць маладое пакаленне, забяспечваючы гарманічнае развіццё асобы і высокі ўзровень агульнаадукацыйных ведаў, фарміраваць ідэйную перакананасць і камуністычную маральнасць, актыўную жыццёвую пазіцыю, рыхтаваць сваіх выхаванцаў да творчай стваральнай працы, ажыццяўляючы мэтанакіраваную прафесіянальную арыентацыю кожнага маладога чалавека.

Рэформа прадугледжвае шэраг мер, накіраваных на выхаванне ў моладзі патрэбнасці да працы, на актыўнае ўключэнне яе ў грамадска-карысную працу, на рэальную падрыхтоўку вучняў да авалодвання выбранай прафесіяй, якая б адпавядала асабістым схільнасцям і грамадскім патрэбнасцям развіцця матэрыяльнай вытворчасці і сферы абслугоўвання. Выдатна тое, што на працягу бліжэйшага дзесяцігоддзя абавязковая ўсеагульная адукацыя будзе дапоўнена ўсеагульнай прафесіянальнай адукацыяй. Гэта горача адабраюць і педагогі і бацькі.

У праекце дастаткова абгрунтавана рэарганізацыя структуры агульнай і прафесіянальнай адукацыі. Пераход да 11-гадовай адукацыі за кошт павелічэння тэрміна навучання ў пачатковым звяне з шасцігадовага ўзросту, відавочна, сапраўды дазволіць у 1—4 класах даць больш трывалую падрыхтоўку да далейшага засваення асноў навук і адначасова паменшыць нагрузку вучням малодшага ўзросту. Мэтазгодна было б прадугледзець для іх два выхадныя дні ў тыдзень, з выкарыстаннем аднаго з іх для пазаўрочнай выхаваўчай работы.

Няпоўная сярэдняя адукацыя будзе завяршацца, як і цяпер, за пяць гадоў навучання ў 5-х — 9-х класах і 9-гадовая школа стане базай як для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў 10—11 класах, так і для далейшага навучання ў прафтэхвучылішчах або сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Прадугледжана, што розныя тыпы ПТВ рэарганізуюцца ў адзіны тып сярэдняга прафтэхвучылішча, колькасць навучэнцаў у якіх за кошт выпускнікоў 9-х класаў у перспектыве павінна павялічыцца прыкладна ўдвая. Важна, што ставіцца задача забяспечыць больш высокі ўзровень агульнаадукацыйных ведаў у навучэнцаў ПТВ, што створыць роўныя ўмовы для паступлення ў ВНУ выпускнікоў ПТВ і сярэдніх школ.

Своечасовымі і неабходнымі з'яўляюцца меры па павышэнню якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. Вопыт работы па ўдасканаленых праграмах сярэдняй школы, у прыватнасці, па гісторыі, пацвердзіў неабходнасць выразнага вызначэння асноўных паняццяў і вядучых ідэй кожнага курса вучэбнай дысцыпліны, патрабаванням па фарміраванню ўменняў і навыкаў вучняў. Апраўдана выключэнне другараднага і надзвычай складанага матэрыялу пры ўмове забеспячэння высокага навуковага ўзроўню выкладання ў мэтах фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду навучэнцаў.

Акцэнтуючы ўвагу ўсіх педагогаў на максімальнае выкарыстанне вучэбнага праграмнага матэрыялу для рашэння задач камуністычнага выхавання моладзі, праект падкрэслівае асаблівую значнасць у гэтым прадметаў грамадска-гуманітарнага цыкла. Выкладчыкі гісторыі адабраюць прапанову павялічыць колькасць гадзін на курс грамадазнаўства.

Актуальнай застаецца задача ўдасканальвання форм, метадаў і сродкаў навучання. Безумоўна, павышэнню якасці ведаў павінна садзейнічаць і памяншэнне напаўняемасці класаў, і павялічэнне выпуску розных сродкаў нагляднасці, ТСН і іншага абсталявання, і ўкараненне найбольш актыўных форм заняткаў. Хацелася б, каб праект прадкрэсліваў неабходнасць выкарыстання розных тыпаў і метадычных варыянтаў заняткаў не толькі ў старэйшых, але і ў сярэдняй паралелі класаў.

Паспяховае вырашэнне складаных задач рэформы школы ў рашаючай ступені, падкрэсліваецца ў праекце, залежыць ад настаўніка, яго ідэйнай перакананасці, прафесійнага майстэрства, эрудыцыі і культуры. Праект ЦК КПСС прасякнуты ленінскім клопатам аб павышэнні аўтарытэту і ролі настаўніка ў жыцці нашага грамадства. Гарачае адабрэнне сустракаюць меры па паляпшэнню ўмоў працы, адпачынку, матэрыяльнаму забяспячэнню настаўніка.

Абмяркоўваючы праект ЦК КПСС аб рэформе агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы, выкладчыкі нашай кафедры падтрымліваюць і адабраюць яго. Кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда КПСС, чэрвеньскага і снежаньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС, устаноўкамі і вывадамі, якія змяшчаюцца ў тэксце выступлення тав. Ю. У. Андропава на снежаньскім (1983 г.) Пленуме ЦК КПСС, наш калектыў вызначыў для сябе канкрэтныя задачы па далейшаму ўдасканальванню падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

**М. ГУСЕВА,**
**асістэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі.**

# ПАЛЯПШАЦЬ ЛЕКЦЫЙНУЮ ПРАПАГАНДУ

На чэрвеньскім (1983 г.) Пленуме ЦК КПСС падкрэслівалася: ідэалагічная работа з'яўляецца справай усёй партыі. Важнае месца ў ёй адведзена Усесаюзнаму таварыству «Веды», яго органам на месцах, у тым ліку і пярвічным арганізацыям. Наш абавязак — апраўдаць высокае давер'е партыі. У гэтай сувязі дарэчы напомніць асноўныя мэты і задачы арганізацыі таварыства «Веды». У адпаведнасці са Статутам мы павінны:

па-першае, распаўсюджваючы палітычныя і навуковыя веды, актыўна ўдзельнічаць у камуністычным выхаванні савецкіх людзей;

па-другое, папулярызуючы новыя дасягненні навукі, тэхнікі, перадавога вопыту, усямерна садзейнічаць павышэнню працоўнай актыўнасці савецкіх людзей, задавальненню іх інтарэсаў і патрэбнасцей;

па-трэцяе, дапамагаючы павышэнню ўзроўню прафесіянальных ведаў спецыялістаў і рабочых, садзейнічаць росту іх дзелавой і вытворчай кваліфікацыі;

па-чацвёртае, далучаючы слухачоў да высокіх каштоўнасцей культуры, мастацтва, літаратуры, абагачаць духоўнае жыццё кожнага савецкага чалавека.

Рашэнне задач, якія пастаўлены перад намі партыяй, залежыць ад многіх фактараў. Да іх можна аднесці:

— удасканаленне зместу, тэматычнай накіраванасці прапаганды і распаўсюджвання ведаў, умацаванне сувязі з жыццём, арыентаванне на ўдзел у рашэнні вытворчых і выхаваўчых задач працоўных калектываў;

— паляпшэнне выхавання і павышэнне лектарскага майстэрства членаў таварыства «Веды»;

— павышэнне ўзроўню практычнай работы кожнай пярвічнай арганізацыі;

— далейшае развіццё грамадскіх пачаткаў у кіраўніцтве прапагандай;

— выхаванне ў кожнага савецкага чалавека патрэбнасці ў працы, добрасумленнай работы на агульную карысць.

Галоўнае — дабіцца, каб працоўнае выхаванне стала справай кожнага лектара. І ў гэтым значная роля належыць педагогам, спецыялістам па пытаннях псіхалогіі. Менавіта яны, працуючы з настаўнікамі, бацькамі, вучнямі аказваюць дапамогу ў выхаванні падрастаючага пакалення,

Мерай эфектыўнасці работы кожнага лектара павінна стаць не колькасць прачытаных лекцый, а іх якасць, рэальнае павышэнне дзелавой кваліфікацыі слухачоў,

Нас чакае вялікая работа — развіваць прапаганду па пытаннях фарміравання разумных патрэб, інтарэсаў асобы. Колькасць лектараў па гэтай тэматыцы невялікая. Мала і дапаможнікаў па распрацоўцы зместу і методыцы асвятлення гэтай праблемы. Абласная арганізацыя таварыства «Веды» чакае дзейснай дапамогі ад адпаведных кафедр нашага універсітэта.

Патрэбны рашучы паварот лектарскага актыву, усіх пярвічных арганізацый у бок працоўных калектываў — канкрэтных фабрык, заводаў, вытворчых аб'яднанняў — бо менавіта тут рашаецца лёс планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

Наша краіна жыве і развіваецца ў складаных міжнародных абставінах, вострага супрацьборства двух палярна супрацьлеглых светапоглядаў, дзвюх палітычных сістэм — сацыялізму і капіталізму. Ідзе барацьба за розумы і сэрцы мільярдаў людзей на планеце. І будучае чалавецтва залежыць у немалой ступені ад вынікаў гэтай ідэалагічнай барацьбы. Неабходна настойліва і пераканаўча даносіць да свядомасці людзей праўду аб нашай знешняй палітыцы, выкрываць планы імперыялізму. У гэтай сувязі неабходна разгарнуць самую шырокую і актыўную работу з моладдзю — у студэнцкіх групах, інтэрнатах, у працоўных калектывах, з навучэнцамі школ.

**В. СТАРАКОЖАВА,**
**адказны сакратар таварыства «Веды» ГДУ.**

*Кубінскай рэвалюцыі—25 гадоў*

# НА ШЛЯХУ РОСКВІТУ

**(Заканчэнне. Пачатак у № 39 за 1983 г. і № 1 за 1974 г.)**

**В**ЫДАТНЫМ дасягненнем сацыялістычнай Кубы з'яўляецца ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі. Дваццаціпяцігадовы вопыт кубінскай рэвалюцыі, яе вялікія здзяйсненні ў галіне культуры, адукацыі, навукі, усяго духоўнага жыцця краіны наглядна пацвердзілі гістарычнае значэнне марксісцкага палажэння аб культурнай рэвалюцыі як неад'емнай складанай частцы сацыялістычнага пераўтварэння.

У 1958 г. на Кубе пры насельніцтве 6,5 млн. чалавек налічвалася 1 млн. поўнасцю непісьменных, больш 1 млн. паўпісьменных. Пачатковую школу наведвала менш палавіны дзяцей школьнага ўзросту, а 10 тыс. настаўнікаў не мелі работы. Сярэдні адукацыйны ўзровень насельніцтва старэй 15 гадоў не дасягаў трох класаў. Навучанне практычна поўнасцю ажыццяўлялася па падручніках, падрыхтаваных у ЗША. Школьнікі далучаліся да амерыканскага ладу жыцця, вывучалі гісторыю ЗША і амаль нічога не ведалі аб гісторыі свайй радзімы.

1961 год увайшоў у нацыянальную гісторыю Кубы як год ліквідацыі непісьменнасці. Выконваючы пастаўлены рэвалюцыйным урадам лозунг «Калі ведаеш — вучы, калі не ведаеш — вучыся», разам з настаўнікамі-прафесіяналамі тысячы настаўнікаў - добраахвотнікаў сталі распаўсюджвальнікамі пісьменнасці. Фарміраванне сістэмы адукацыі ішло інтэнсіўна. Спецыфіка кубінскага вопыту заключаецца ў тым, што доступ да адукацыі гарантаваўся не толькі абвяшчэннем нацыяналізацыі ўсіх навучальных устаноў, але і яе бясплатнасцю, пераводам на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне значнага кантынгенту навучэнцаў. Шырокае развіццё ў краіне атрымала сістэма інтэрнатаў і школ падоўжанага дня, Штогодныя расходы дзяржавы на патрэбы адукацыі павялічыліся с 1958 года ў ў 16 разоў і складаюць больш 1,5 млрд. песа ў год.

Сёння Куба з'яўляецца першай на лацінаамерыканскім кантыненце краінай суцэльнай пісьменнасці. Яе народ стаў адным з самых чытаючых у свеце. Усімі відамі бясплатнага навучання на Кубе ахоплена больш 3 млн. чалавек.

Сістэма агульнай адукацыі з тэрмінам навучання 12 год ахоплівае практычна ўсіх дзяцей школьнага ўзросту. Яна ўключае школу першай ступені, якая дае пачатковую адукацыю дзецям ад 6 да 12 гадоў (1—6 класы); школу другой ступені, якая дае няпоўную сярэднюю адукацыю (7—9 класы); школу трэцяй ступені, якая дае поўную сярэднюю адукацыю. Асаблівасць структуры нацыянальнай адукацыі на Кубе заключаецца ў тым, што паралельна з агульнай школай існуе сістэма навучання для дарослых, у якой на 1 верасня 1983 г. налічвалася 400 тыс. чалавек (пачатковая і сярэдняя школы, рабоча-сялянскія факультэты па падрыхтоўцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы). Па даных апошняга перапісу насельніцтва (1980 г.) сярэдні ўзровень школьнай адукацыі сярод дарослага насельніцтва дасягнуў 6, 4 класа. На II з'ездзе Кампартыі Кубы (снежань 1980 г.) была пастаўлена задача ўвядзення абавязковай дзесяцігадовай адукацыі. Значныя поспехі вышэйшай школы. У ВНУ сёння навучаецца больш 200 тыс. чалавек, што ў 18 разоў перавышае колькасць студэнтаў да рэвалюцыі.

Цікавы вопыт сацыялістычнай Кубы ў выхаванні моладзі. Асноватворным яго прынцыпам стала спалучэнне вучобы і працы, што садзейнічае фарміраванню камуністычнай свядомасці новага пакалення і ў той жа час дазваляе моладзі ўносіць рэальны ўклад у дасягненні краіны. Прыкладам гэтага з'яўляецца прынцыпова новы тып агульнаадукацыйных школ — «школы ў поле». Кожная з іх уяўляе сабой сярэднюю навучальную ўстанову, як правіла, II—III ступеней, дзе школьнікі аднучасова вучацца і выконваюць сельскагаспадарчыя работы. Кожная школа разлічана на 500 вучняў, якія жывуць пры поўным дзяржаўным забеспячэнні на рэжыме інтэрната, апрацоўваюць і вырошчваюць сельгаскультуры на 500—700 га.

Вялікую цікавасць уяўляюць таксама і прафесіянальныя сярэднія школы, якія атрымалі назву «школа па прызванню». Яны заклікаy садзейнічаць гарманічнаму развіццю моладзі, далучаючы яе да мерапрыемстваў вучэбнага, вытворча-політэхнічнага, культурнага і спартыўнага характару. Школай такога тыпу з'яўляецца інтэрнат імя У. І. Леніна, дзе расходы на аднаго вучня складаюць каля 900 песа ў год, а прадукцыю ён выпрацоўвае на 1000 песа. У гэтай школе ёсць свае тэлестудыя, вылічальны цэнтр, два басейны, вытворчы цэх па зборцы транзістарных прыёмнікаў, фабрыка па выпуску партатыўных лічыльных машынак і майстэрня па вытворчасці батарэек для транзістарных прыёмнікаў, вытворчы ўчастак па зборцы тэлевізійных антэн, лабараторыю па зборцы і наладцы лічбавых вылічальных машын. За школай замацавана 500 га цытрусавых плантацый.

Пошукі новых форм забеспячэння арганічнага спалучэння навучання і прадукцыйнай працы вядуцца таксама і ў сістэме вышэйшай школы. На прамысловых прадпрыемствах, у правінцыях ствараюцца рабочыя аддзяленні універсітэцкага цэнтра і філіалы, якія дазволілі наблізіць універсітэцкую адукацыю да вытворчасці. Тут студэнты з мінімальнымі затратамі часу маюць магчымасць удзельнічаць у прадукцыйнай працы, а рабочыя — атрымаюць вышэйшую аду-

*Нашы юбіляры*

# ЧАЛАВЕК НЕСПАКОЙНАГА СЭРЦА

Гэтымі днямі калектыў гісторыка-філалагічнага факультэта адзначыў паўвекавы юбілей загадчыцы кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі Зоі Мікалаеўны Сарока. Параўнальна нядаўна прыйшла яна ва універсітэт, але дзякуючы свайму багатаму жыццёваму вопыту, аўтарытэту даследчыка і ўменню працаваць з людзьмі, хутка заваявала агульнае прызнанне сваіх калег. У 1980 годзе ёй даверылі ўзначаліць нашу кафедру.



З. М. Сарока нарадзілася ў Мінску ў сям'і ваеннаслужачага. Вучылася ў Магілёве, куды пасля вайны перавялі на службу яе бацьку. У 1958 годзе яна скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут. Яшчэ будучы студэнткай, Зоя Мікалаеўна выбіраецца на камсамольскую работу. Пэўны час яе працоўная дзейнасць была звязана з камсамолам і на Украіне. Для абагачэння яе жыццёвым вопытам многае значыла работа ў праўленні таварыства «Веды» Беларускай ССР.

У 1971 годзе пасля паспяховага заканчэння аспірантуры З. М. Сарока становіцца навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР. Тут прайшла пара яе сталення як вучонага-гісторыка, аднаго з вядомых спецыялістаў у галіне даследавання пытанняў камуністычнага выхавання, культурных і навуковых сувязей братніх рэспублік СССР. У 1972 г. Зоя Мікалаеўна паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю. Цяпер яна на высокім навукова-метадычным узроўні чытае лекцыі па складанаму курсу гісторыяграфіі айчыннай гісторыі, кіруе спецсемінарам, студэнцкімі навуковымі даследаваннямі. Ёй шмат зроблена для таго, каб узняць на больш высокі ўзровень вучэбную, метадычную і навуковую работу кафедры.

Асабліва значнай з'яўляецца заслуга З. М. Сарока ў актывізацыі навуковых даследаванняў на кафедры. Зоя Мікалаеўна ажыццяўляе кіраўніцтва дзяржбюджэтнай тэмай «Рабочы клас БССР у перыяд будаўніцтва сацыялізму і камунізму», па якой у апошнія гады апублікаваны шэраг навуковых прац, падрыхтаваны манаграфіі. Кіраўніку гэтай тэмы належыць каля трох дзесяткаў навуковых прац, выдадзены ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх выдавецтвах.

Зоя Мікалаеўна з'яўляецца настаўнікам маладых выкладчыкаў, садзейнічае іх навуковаму росту. У тым, што за 1983 год калектыў нашай кафедры папоўніўся трыма кандыдатамі навук з ліку былых выпускнікоў універсітэта, што рыхтуюць да абароны дысертацыі яшчэ некалькі чалавек, — немалая заслуга і Зоі Мікалаеўны.

У бягучай пяцігодцы па ініцыятыве З. М. Сарока наша кафедра ўзмацніла плённае супрацоўніцтва ў галіне навуковых даследаванняў і падрыхтоўкі кадраў з Інстытутам гісторыі АН БССР. Пры гэтым інстытуце паспяхова дзейнічае філіял кафедры, у якім працуюць вядомыя беларускія вучоныя, доктары гістарычных навук У. І. Мялешка, У. А. Палуян, З. Ю. Капыскі і інш.

Зоя Мікалаеўна — чалавек неспакойнага сэрца, заўсёды наперадзе і ў грамадскім жыцці. Яна неадназова выбіралася членам партыйных органаў у Мінску, з'яўлялася намеснікам сакратара партбюро факультэта, старшынёй групы народнага кантролю. Зараз яна кіруе навукова-метадычным саветам і з'яўляецца членам праўлення абласной арганізацыі таварыства «Веды». Яе добра ведаюць і ў абласным інстытуце ўдасканальвання настаўнікаў, і ў таварыстве аховы помнікаў гісторыі і культуры. За актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных З. М. Сарока ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Зоя Мікалаеўна знаходзіцца ў росквіце сваіх творчых і жыццёвых сіл. Калектыў кафедры, студэнты і выкладчыкі гісторыка-філалагічнага факультэта жадаюць ёй добрага здароўя, асабістага шчасця, новых поспехаў на навукова-педагагічнай ніве.

**Р. ЛАЗЬКО,**
дацэнт.

**В. МАСЛЮКОЎ,**
партгрупорг кафедры.

# ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ САВЕТ СССР

Кніжны магазін № 19 прапануе літаратуру да выбараў у Вярхоўны Савет СССР:

Панасюк М. В. У авангардзе камуністы. М.: Беларусь, 1983.

Уманскі Л. А. Рост народнага дабрабыту ў СССР. М.: Фінансы і статыстыка, 1983.

Курыцын В. М. Развіццё праў і свабод у савецкай дзяржаве. М.: Юрыдычная літаратура, 1983.

В. А. Фамін і інш. Сацыялістычная дэмакратыя. Мн.: Беларусь, 1983.

Юрчанка В. С. Не толькі права... Мн.: Беларусь, 1983.

Палажэнне аб арганізацыі работы з наказамі выбаршчыкаў у Беларускай ССР. Мн.: Беларусь, 1982.

Закон БССР аб выбарах у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў Беларускай ССР. Мн.: Беларусь, 1982.

Л. І. Няздзеля. Маральныя асновы сацыялістычнага ладу жыцця. Мн.: Выд-ва БДУ ім. Леніна, 1983.

Роля грамадзянскага і сямейнага заканадаўства ў забеспячэнні канстытуцыйных праў і абавязкаў грамадзян СССР. М.; Навука, 1983.

**Н. ШАТОН,**
прадавец магазіна № 19.

# ПАТРЭБНЫ АГУЛЬНЫ КЛОПАТ

Прайшло паўтара месяца з дня адкрыцця студэнцкага кафэ універсітэта. За гэты час тут праведзены цікавыя вечары, сустрэчы. Усе яны былі розныя і па-свойму цікавыя.

Студэнты матэматычнага факультэта, байцы інтэрнацыянальнага атрада і СБА універсітэта нядаўна сустрэліся з ветэранамі будатрадаўскага руху ГДУ. Гэты вечар запамятаўся ўсім: было расказана шмат смешных гісторый, цікавых выпадкаў, якія адбыліся за час працоўнага семестра.

Прыйшла чарга эканамістам падрыхтаваць вечар у нашым утульным кафэ. Студэнткі 2-га курса аддзялення эканомікі працы Н. Фаменка, В. Цярашкова, А. Шарова, Г. Шульцава актыўна ўзяліся за яго падрыхтоўку. Яны напісалі сцэнарый, запрасілі ў госці студэнтаў фізічнага факультэта.

Чацвёртакурснікі эканамічнага факультэта В. Любіч і А. Гелясаў — актыўныя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці — выконвалі песні, якія спадабаліся ўсім. Удзельнік студэнцкага тэатра мініяцюр фізічнага факультэта А. Смакаў паказваў гумарыстычныя мініяцюры. За час яго выступлення ў зале не сціхаў смех.

Вечар прайшоў у вельмі сяброўскай, добразычлівай атмасферы. Але хочацца адзначыць, што праграмы ў кафэ павінны насіць тэматычны характар, а не толькі проста пацяшальны. Мы павінны пазнаваць радасць чалавечых зносін з цікавымі людзьмі, з прыгожым. Гэта абавязаны ўлічваць арганізатары вечароў у студэнцкім кафэ.

І яшчэ хочацца падкрэсліць: прайшло паўтара месяца з дня адкрыцця кафэ, а некаторыя праблемы застаюцца нявырашанымі. Савету кафэ мала хто дапамагае ў рабоце. Дапамога ж ім патрэбна пастаянная, і не толькі матэрыяльная, але і эстэтычная. Неабходна, каб кожная група, якая праводзіць вечар, пакінула пасля сябе добры след, таму што яшчэ не набыта пасуда, патрабуе пэўнай дапрацоўкі інтэр'ер кафэ.

Будзем спадзявацца, што студэнты і супрацоўнікі нашага універсітэта, якія жадаюць змястоўна праводзіць тут вольны час, па меры магчымасці ўнясуць і свой уклад у тое, каб студэнцкае кафэ ГДУ стала месцам незабыўных сустрэч.

**І. НЕШЫК,**
студэнтка групы Т-23 эканамічнага факультэта, адказная за прэсцэнтр.

# СПОРТ

## У ДЗЕСЯТЦЫ МАЦНЕЙШЫХ

Па традыцыі ў пачатку студзеня рэдакцыя абласной газеты «Гомельская праўда» праводзіць апытанне трэнераў, работнікаў ДСТ і спорткамітэтаў, сваіх шматлікіх чытачоў з мэтай вызначыць дзесятку мацнейшых спартсменаў прайшоўшага года. Асаблівую цікавасць выклікала грамадская думка наконт лепшых за 1983 год. Справа ў тым, што вызначаліся мацнейшыя спартсмены передалімпійскага сезона. Магчыма, некаторым з іх пашчасціць удзельнічаць у прадстаячых Алімпійскіх гульнях.

Пальма першынства аддадзена былому студэнту факультэта фізвыхавання нашага універсітэта М. Кіраву. Другую суму галасоў набраў абсалютны чэмпіён СССР 1983 г. па боксу А. Юкаў. На трэцяе месца выйшаў чэмпіён VIII летняй Спартакіяды народаў СССР па барацьбе самба В. Крываногаў.

У табелі аб рангах пяты радок заняла студэнтка-завочніца нашага універсітэта майстар спорту СССР міжнароднага класа, бронзавы прызёр VIII летняй Спартакіяды народаў СССР па спартыўнай гімнастыцы ў камандным заліку, чэмпіёнка Сусветнай універсіяды-83 А. Палявая. Восьмае месца дасталося першакурсніку факультэта фізвыхавання, майстру спорту СССР міжнароднага класа, пераможцу III Усесаюзных спартыўных гульняў моладзі па веславанню на байдарках і каноэ В. Борыкаву, дзесятае — студэнту гэтага ж факультэта, майстру спорту СССР, бронзаваму прызёру VIII Спартакіяды народаў СССР па вольнай барацьбе Н. Айвазяну.

*Гэта цікава*

# ЦІ ВЕДАЕ СТО МОЎ ПЕНТ НУРМЕКУНД?

Неяк загадчык кафедры рускай літаратуры Тартускага універсітэта Ісакаў, які сам валодае многімі мовамі, задаў дацэнту Пенту Нурмекунду, здавалася б, простае пытанне: «Паслухай, Пент, а колькі моў ведаеш ты?».

— Не лічыў, — адказаў ён і растлумачыў: — Практычна цяжка правесці граніцу паміж веданнем і няведаннем мовы.

— Але хаця б прыкладна.... Моў пяцьдзесят ведаеш?

— Ну пяцьдзесят, напэўна, ведаю.

— А можа, усе сто?

— Не, ста не ведаю, — пасля нявялікага роздуму адказаў Нурмекунд.

У Тартускім універсітэце Пент Нурмекунд вядомы як адзін з вельмі рэдкіх паліглотаў свету — валодае большасцю еўрапейскіх, асноўнымі старажытнымі і ўсходнімі мовамі, некаторымі афрыканскімі і амерыканскімі мовамі.

Нарадзіўся Пент у буржуазнай Эстоніі, у сям'і беднага сельскагаспадарчага рабочага з Пярнумаа і па гэтай прычыне толькі ў 12 гадоў трапіў у школу. Вось там і высветлілася, што вясковага хлапчука адрознівае рэдкая страсць — ён вельмі цікавіўся незразумелымі словамі. У сяле быў салдат, удзельнік руска-японскай вайны, які крыху гаварыў па-кітайску. І хлапчук хутка вывучыў усё, што той ведаў. У Вільяндзі пасяліўся ў дамы, якая служыла боннай у сям'і рускага дыпламата, захапіўся японскай мовай.

Сістэматычна ж пачаў займацца мовамі ўжо у Тартускім універсітэце. Ён спецыялізаваўся па германскай і раманскай філалогіі і індаеўрапейскаму мовазнаўству. Акрамя гэтага хадзіў на ўсе заняткі па тых мовах, якія выкладаліся тады ва універсітэце. Вывучаў сяміцкія, усходнія мовы, кітайскую, самадзійскую. Адно студэнцкае лета правёў у ліваў, маленькай вымiраючай народнасці на тэрыторыі Латвіі. І вывучыў лівійскую, а разам з тым і латышскую мовы.

За тры гады Нурмекунд закончыў універсітэцкі курс, але прагу ведаў да моў не наталіў. Наняўся матросам на параход і адправіўся без капейкі ў кішэні ў Капенгаген. Зарабляў на жыццё, працуючы дворнікам, «зайцам» хадзіў на заняткі ў Капенгагенскі універсітэт. Неадноычы праганялі, але ён прыходзіў зноў.

Ужо «пракладзеным шляхам» — матросам прыплыў у Дзюнкерк, адтуль дабраўся да Руана, марыў дабрацца да Японіі. Але захварэў, і давялося вярнуцца дадому. На параходзе завяршыў сваю магістэрскую дысертацыю па сінтаксісу старафранцузскай мовы, напісаную па-іспанску, і паспяхова яе абараніў. Потым усміхнулася шчасце — ужо на універсітэцкую стыпендыю пабываў у Гётэборгу, Ростоку, Мюнхене, Парыжы. Цяжка скласці пералік моў, якімі авалодаў яшчэ.

Чвэрць стагоддзя таму назад Пент арганізаваў у Тартускім універсітэце кабінет арыенталістыкі, у якім факультатыўна, для жадаючых выкладаў такія мовы, як кітайская, хіндзі, суахілі і афрыканс, армянская, класічная арабская, старажытнаегіпецкая, а затым і большасць еўрапейскіх.

З тых, хто займаўся ў Нурмекунда, атрымаліся буйныя спецыялісты па мовах і культурах народаў свету, многія з іх ужо самі выкладаюць у кабінеце, іншыя вядуць сур'ёзную навукова-даследчую работу. Былыя студэнты геолагі Х. Удам і Ю. Сірк закончылі аспірантуру ў Інстытуце ўсходазнаўства АН СССР ў Маскве, і першы стаў вядомым спецыялістам па фарсі, а другі — буйным даследчыкам інданезійскіх моў і культуры. Л. Мыль зараз сам выкладае ў ТДУ санскрыт, цібецкую і тамільскую мовы. Але напэўна, галоўная заслуга кабінета арыенталістыкі заключаецца ў тым, што Эстонія займае адно з першых месц у краіне па колькасці моў, з якіх робіцца прамыя пераклады.

Пент Нурмекунд і цяпер шмат падарожнічае, нядаўна вярнуўся з Ташкента, быў у Фрунзе — вывучыў дунганскую мову. Паліглот, якіх мала на планеце, Пент Нурмекунд перакананы: усякі чалавек можа авалодаць ямногімі мовамі, варта толькі як след захацець.

**Г. ГУКАСАЎ,**
(Газета «Известия»).

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 11015
Заказ 231.